Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40

DOI:10.17951/sb.2024.18.141-157
Studia Białorutenistyczne 18/2024 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Zoya Tratsiak

Euphrosine Polotskaya State University of Polotsk (Belarus)
e-mail: zoya.tretyak@rambler.ru
https://orcid.org/0000-0002-5752-9058

# Спецыфіка пазіцыявання тэмы Першай сусветнай вайны ў беларускай прозе 1920–30-х гг.

*The specifics of the First World War theme Positioning in Belarusian Prose of the 1920s–30s*

*Specyfika tematu pierwszej wojny światowej w prozie białoruskiej z lat 1920–1930*

**Abstract**

The article examines the results of the study of Belarusian literature of the 1920s and 30s, dedicated to the events of the First World War. Based on the prose by Symon Baranavykh, Zmìtrok Biadula, Platon Galavach, Ales Garodni, Cìshka Gartny, Maksìm Garetskì, Mìkhas Zaretskì, Kandrat Krapìva, Yanka Lìmanovskì, Mìkola Loban, Mìkhas Lynkov, Mìkhas Mialeshka, Makar Pasladovich, Eduard Samujlonak, Yan Skrygan, Kuzma Chorny, the main thematic groups are distinguished: front, rear, and refugee, the theme of life under German occupation. The complementarity of these groups is proven. They comprehensively embodied various manifestations of war and their impact on an ordinary eyewitness or participant in hostilities. The role of the image of the enemy, whose perception changes under the influence of acquired experience, is noted. The conceptual significance of the continuous war motif is determined. It allows to depict the events of 1914–1918 in inextricably connection with the national history of the 20$^{th}$ century. The presence of a special gap between the presentation of the First World War theme in the literature of the 1920s and 30s and its interpretation in Belarusian literary studies is emphasized.

**Keywords**: the First World War, Belarusian literature, war prose, complementarity, continuous war motif

**Abstrakt**

Artykuł został poświęcony tematyce pierwszej wojny światowej w literaturze białoruskiej z lat 1920–1930. Proza Symona Baranawych, Zmitraka Biaduli, Płatona Haławacza, Alesia Harodni, Ciszki Hartnego, Maksima Garèckìego, Maksima Zareckiego, Kandrata Krapiwy,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Janki Limanoŭskiego, Mikoły Łobana, Michasia Łyńkoua, Michasia Mialeszki, Makara Pasladowicza, Eduarda Samujlonka, Janki Skrygana, Kuźmy Czornego jest klasyfikowana ze względu na trzy różne ujęcia wydarzeń wojennych: z punktu widzenia doświadczeń żołnierzy na froncie, z perspektywy uchodźcy, w aspekcie okupacji niemieckiej. Ujęcia te wzajemnie się uzupełniają, tworząc wieloaspektowy obraz wojny, mającej destrukcyjny wpływ na uczestnika lub świadka wydarzeń wojennych. Znaczącą rolę pełni tu obraz uwikłanego w historię bohatera, który pod wpływem traumatycznych przeżyć ulega dramatycznej przemianie wewnętrznej. W artykule autorka omawia znaczącą rolę motywu wojny jako swoistego kontinuum łączącego wydarzenia z lat 1914–1918 z dwudziestowieczną historią kraju. Badanie dowiodło komplementarności obrazów i motywów w wybranych grupach tekstów, jak również rozbieżności pomiędzy prezentacją tematu pierwszej wojny światowej w literaturze z lat 1920–1930. a jego interpretacją w białoruskim literaturoznawstwie.

**Słowa kluczowe**: pierwsza woja światowa, literatura białoruska, proza wojenna, komplementarność, motyw wojny jako kontinuum

**Анатацыя**

У артыкуле разглядаецца адлюстраваннне тэмы Першай сусветнай вайны ў беларускай літаратуры 1920–30-х гадоў. На матэрыяле прозы Сымона Баранавых, Змітрака Бядулі, Платона Галавача, Алеся Гародні, Цішкі Гартнага, Максіма Гарэцкага, Міхася Зарэцкага, Кандрата Крапівы, Янкі Ліманоўскага, Міколы Лобана, Міхася Лынькова, Міхася Мялешкі, Макара Паслядовіча, Эдуарда Самуйлёнка, Яна Скрыгана, Кузьмы Чорнага вылучаюцца асноўныя тэматычныя групы: франтавая, тылавая і бежанская, тэма жыцця пад нямецкай акупацыяй. Доказна сцвярджаецца камплементарнасць дадзеных груп, якія комплексна ўвасобілі разнастайныя праявы вайны і іх уплыў на шараговага відавочцу ці ўдзельніка баявых дзенняў. Адзначаецца роля вобраза ворага, успрыманне якога змянялася пад уплывам набытага вопыту. Вызначаецца канцэптуальная значнасць матыву вайна / навала-кантынуум, які дазваляе адлюстраваць падзеі 1914–1918 гг. у непарыўнай сувязі з айчыннай гісторыяй ХХ ст. Падкрэсліваецца прысутнасць адмысловага разрыву паміж прэзентаванасцю тэмы Першай сусветнай вайны ў літаратуры 1920–30-х гг. і яе асэнсаваннем у беларускім літаратуразнаўстве.

**Ключавыя словы**: Першая сусветная вайна, беларуская літаратура, ваенная проза, камплементарнасць, матыў вайна / навала-кантынуум

Асаблівым перыядам для беларускай прозы, паэзіі і драматургіі былі 1920–30-я гг. ХХ ст., калі пісьменнікі асэнсоўвалі новыя пласты рэчаіснасці, эксперыментавалі з рознымі мастацкімі формамі: ад мадэрнісцкіх да сацрэалістычных; актуалізавалі асобныя набыткі мінулага (напрыклад, стварылі цэлы шэраг мастацкіх вобразаў з адсылкамі да паэтыкі вуснай народнай творчасці) і ў той жа час засвойвалі эстэтыку авангарду.

Беларуская літаратура пра Першую сусветную вайну доўгі час заставалася на перыферыі чытацкай і даследчыцкай увагі. У вядомых кнігах беларускіх

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



і рускіх, пазней – савецкіх аўтараў увасабляліся найперш падзеі 1917 г., Грамадзянскай вайны (*Сцежкі-дарожкі* Міхася Зарэцкага, *Дрыгва* Якуба Коласа, *Жалезны паток* Аляксандра Серафімовіча, *Разгром* Аляксандра Фадзеева, *Цэмент* Фёдара Гладкова, *Ціхі Дон* Міхаіла Шолахава, *Блуканне па пакутах* Аляксея Талстога). Асобныя згадкі той эпохі адлюстроўваліся таксама ў прозе пра вайну Вялікую Айчынную (*Хатынская аповесць* Алеся Адамовіча, *Жураўліны крык*, *Сотнікаў*, *Знак бяды* Васіля Быкава, трылогія *Сасна пры дарозе*, *Вецер у соснах*, *Сорак трэці* Івана Навуменкі, пенталогія *Трывожнае шчасце* Івана Шамякіна, *Жывыя і мёртвыя* Канстанціна Сіманава, *Гарачы снег* Юрыя Бондарава, і інш.).

На такім фоне, пачынаючы з 1920-х гг., у літаратурнай крытыцы амаль на цэлае стагоддзе ўкаранілася меркаванне, што „імпэрыялістычныя вайна ў нашай беларускай літаратуры <...> адбілася досыць слаба. Калі ня лічыць вершаў Купалы, Коласа, Бядулі і інш., напісаных у часе вайны, ды некалькіх дробных апавяданьняў, то мы больш нічога ня маем”[1] (Alig, 1926, s. 103). У такім кантэксце „выключэннем” выглядала проза Максіма Гарэцкага, які доўгі час літаральна аднаасобна годна сведчыў пра распрацоўку тэмы Першай сусветнай у беларускай літаратуры.

*На імперыялістычнай вайне* – самы знакаміты твор у беларускім мастацтве слова, прысвечаны падзеям 1914–1918 гг. Наватарская канцэпцыя спалучэння аўтабіяграфічнага, дакументальнага і мастацкага матэрыялу, паслядоўна рэалізаваная М. Гарэцкім у гэтым творы, пацвердзіла сваю жыццяздольнасць, бо „феномен факта, уключанага ў тэкст, выяўляецца ў тым, што ён функцыянуе як мастацкі вобраз, тым самым пашыраючы творчыя магчымасці пісьменніка. Ён адкрывае перад намі новую з’яву: пісьменніцкае пераасэнсаванне рэчаіснасці пры канкрэтных гістарычных, палітычных і сацыяльных умовах” (Gubskaâ, 2019, s. 64). У другой палове XX ст. сімбіёз аповедных стратэгій быў запатрабаваны беларускай ваеннай літаратурай (кнігі Алеся Адамовіча *Я з вогненнай вёскі...* (у суаўтарстве з Янкам Брылём і Уладзіірам Калеснікам), *Блакадная кніга* (у суаўтарстве з Даніілам Граніным). У іх „экстрэмальная рэальнасць эсксрэмальна ж пераўзышла, падавіла гіпатэтычную мастацкую фантазію на адпаведныя тэмы” (Sìnʹkova, 2017, s. 67). А. Адамовіч тлумачыў папулярнасць дакументальна-мастацкай прозы так: „было б дзіўна, каб пасля замоўчвання

[1] Падобная скрушна-крытычная рыторыка літаратуразнаўцаў у 1920-я гг. распаўсюджвалася не толькі на мастацкую творчасць, прысвечаную Першай сусветнай вайне. Так, Ілля Крас у артыкуле *Чырвоная Армія ў беларускай літаратуры* адзначаў: „Зірнем у мастацкую творчасьць празаічнага жанру. Трэба прызнаць, што тут аб чырвонаармейскіх паходах мы знойдзем ня так шмат. У нас яшчэ не зьявіўся свой Фурманаў, раманы якога („Чапаев”, „Мятеж” і інш.) зьяўляюцца няўмiручым летапісам грамадзянскай вайны; у нас ня было яшчэ Ўс. Іванова, свайго Бабеля” (Kras, 1928, s. 2).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



найбольш значных фактаў чытач не кідаўся б на дакументы, не адчуваў бы пякучую неабходнасць ведаць факты" (Adamovič, 1982a, s. 409).

Грамадска-палітычныя трансфармацыі, якія распачаліся ў 1917 г., не спрыялі шматбаковай распрацоўцы тэматыкі, звязанай з імперыялістычнай вайной: „Першая сусветная вайна для савецкай літаратуры 20-х і 30-х гадоў <...> адхінута <...> падзеямі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны" (Adamovič, 1982b, s. 25). Паказальна, што вайна 1914–1918 гг. успрымаецца як „забытая" не толькі беларускімі мастакамі слова і літаратуразнаўцамі. У выпадку з айчыннай навукай і масавай свядомасцю такое адмысловае стаўленне да феномену Першай сусветнай тлумачыцца пераважна грамадска-палітычнымі чыннікамі, што ж датычыцца замежнага пункта погляду, то на першы план выходзяць больш індывідуалізаваныя фактары. Так, англійскі пісьменнік Себасцьян Фолкс, рыхтуючы ўступ да рамана *Птушыныя спевы*, адзначыў:

> Я адчуваў, што вопыт гэтай вайны нейкім чынам „выслізнуў" з-пад увагі шырокай публікі – здаецца, нават добра адукаваныя людзі мелі пра яе дастаткова цьмяныя ўяўленні. Часткова гэта тлумачылася маўчаннем тых, хто патрапіў на тую вайну. Раней чалавечая гісторыя яшчэ не ведала такой бойні – як маглі гэтыя людзі распавесці пра яе? Да таго, усяго праз дваццаць год свет затрэсла другое вар'яцтва гэтага ж кшталту (Faulks, 2012, p. VII)[2].

Тым не менш, нягледзячы на аб'ектыўныя гістарычныя чыннікі, у беларускай літаратуры вайна 1914–1918 гг. атрымала яскравую спецыфічную прэзентацыю: падзеі сусветнага ўзброенага канфлікту актыўна асэнсоўваліся ў тэкстах з іншай – „гісторыка-рэвалюцыйнай" – вядучай тэмай (*Набліжэнне* Змітрака Бядулі, *Затока ў бурах* Янкі Скрыгана, *Сокі цаліны* (квадры III, IV) Цішкі Гартнага, *Сцежкі-дарожкі* Максіма Зарэцкага, *Крывавы вір*, *На шляхах волі*, *Вайна вайне* Якуба Коласа, *На чырвоных лядах* Міхася Лынькова, *За плячыма гадоў* Міколы Нікановіча, *Бацькаўшчына* і *Пошукі будучыні* Кузьмы Чорнага) і інш.

У 2014 г. Міхась Мушынскі, рыхтуючы да перавыдання паэму Я. Коласа *На шляхах волі*, адзначыў:

> Даты, падобныя стагоддзю пачатку вайны, – нагода асэнсаваць горкія ўрокі мінулага, каб пазбегнуць таго, што давялося перажыць і салдатам-франтавікам, і мірным працаўнікам горада і вёскі. Тым не менш асэнсоўваць вопыт мінулага патрэбна. І неабходна таксама пашыраць кола праблем, шукаць новыя аспекты вывучэння вайны (Mušynskì, 2014, s. 5).

---

[2] „I felt that the experience of this war had somehow slipped from the public understanding; even educated people seemed vague about it. This was in part due to the reticence of those who had been there. In the whole of human history, no one had ever seen such slaughter before, so how were these men to talk about it? Then, only 20 years later, a second frenzy had convulsed the world". Пераклад цытаты на беларускую мову аўтара артыкула.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Нашы ўласныя назіранні дазваляюць сцвярджаць існаванне адмысловага разрыву паміж фактычнай наяўнасцю тэмы Першай сусветнай вайны ў літаратурным працэсе 1920–30-х гг. і ўзроўнем яе навуковага асэнсавання.

На нашу думку, беларуская літаратура пра Першую сусветную вайну ўмоўна падзяляецца на *франтавую, бежанскую і тылавую*. Адзначым і філасофска-алегарычныя творы: *Волат*, *Балада*, *Галгофа* Змітрака Бядулі, *З'ява* Зоські Верас, *Фантазія* Максіма Гарэцкага, *Вечны пакой* Вацлава Ластоўскага. У іх сінтэзывалася народная памяць і вопыт прыватнага ўдзельніка / відавочцы ваенных падзей. Акрамя таго, у падобных творах матыў *вайна / навала-кантынуум* набываў адмысловы ўніверсальны сэнс, бо апісаныя баявыя дзеянні і іх наступствы ў аднолькавай ступені характарызавалі і войны мінулага, і бітвы будучыні. Так, Змітрок Бядуля пісаў:

> Соняйка атуляна густым дымам пажарышч. Стрэлы гудуць па бакох, як птушкі сьмерці.
> Чырвоныя аграмадныя языкі абхопліваць пякельным агнём гарады і сялібы.
> У пакуці вялікай, людзі зліліся ў адну грамаду <...> Нібы завароржаныя пякельнікам поўзаюць яны ў холадзі, ў голадзі па зямлі <...>
> Іх сьцяг – цёмная, караючая сьмерць.
> Іх натхненьне – жудасная, страшная мука.
> Іх эмблема – атрутнае, бязмежнае нішчасцьце.
> Забіваюць іх, і яны забіваюць (Bâdulâ, 1917, s. 2).

Філасофска-алегарычныя творы канстатавалі, што сутнасць вайны і яе базавыя праявы не змяняліся ў сувязі са з'яўленнем магутных сродкаў вынішчэння і распрацоўкай новай тактыкі вядзення баявых дзеянняў.

Заўважаецца моцная тэндэнцыя да камплементарнасці многіх элементаў з названых трох плыняў, па-рознаму прадстаўленых і ў межах аднаго канкрэтнага твора, і ў межах айчыннага прыгожага пісьменства 1920–30-х гг., якое асэнсоўвала падзеі 1914–1918 гг. як унікальны час: „Вайна, рэвалюцыя, зноў вайна. Навошта яно ўсё гэта? Чаго не падзеляць людзі? Завіхрылася жыццё і бурліць, як чорны вір. Калі ж будзе спакой? Што будзе далей?" (Kolas, 1975, s. 214). Памкненне пісьменнікаў да сінтэзу было звязана з патрэбай асэнсаваць нязнаную раней дынаміку татальнага ваеннага супрацьстаяння, аксіялагічныя трансфармацыі, уплыў на псіха-фізічны стан і сацыяльны статус шарагавага ўдзельніка ці відавочцы вайны.

Беларуская *франтавая проза* прысвечана службе на вайне салдата, вольнапісанага, радзей малодшага афіцэра-беларуса ў войску Расійскай імперыі. Гэты факт вызначыў тэматычныя дамінанты падобных аповедаў: адлюстраванне франтавога побыту часоў зацішша, атак і контрудараў, жыцця на маршы, знаходжання ў тыле з-за ранення, па даручэнні камандавання, у кароткім адпачынку. Акрамя запісак *На імперыялістычнай вайне*, апавядання *Генерал*, асобных раздзелаў *Камароўскай хронікі* Максіма Гарэцкага, назавем апавяданні *На стаянцы*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Змітрака Бядулі, *У поплавах* Алеся Гародні, фрагменты з рамана *Праз гады* Платона Галавача. Асобна ў гэтым шэрагу знаходзіцца аповесць Гародні *Варта на Рэйне*: твор, у якім апавядаецца пра жыццё Альфрэда Кляйна – шараговага з нямецкага войска.

Паказальна, што беларускія пісьменнікі не засяроджваліся выключна на батальным, хаця і вырашалі адмысловую мастацкую задачу, апавядаючы пра баявы складнік татальнай вайны:

> З боку немцаў пачуліся вінтовачныя стрэлы <...> Над акопамі праляцелі са свістам, свідруючы паветра, першыя нямецкія снарады і разарваліся далёка за акопамі. Пасля, намацваючы лінію акопаў, снарады пачалі падаць бліжэй, уздымаючы ў часе разрываў цэлыя горы зямлі, жудасны грукат і звон і танклявы свіст, які пакідалі за сабой, адлятаючы ад месца разрыву, жалезныя аскабалкі снарадаў. Перапалоханыя салдаты <...> азіраліся назад, заміраючы ў жудасным чаканні, што чарговы снарад упадзе ў акопы. А снарады кладліся ўсё бліжэй і бліжэй <...> Ужо аскабалкі чугуну звіняць над самымі галовамі. Яшчэ момант, і перад вачыма ў салдат узнялася чорная сцяна пяску і дыму і сыпанула зямлёй у акоп (Galavač, 1984, s. 115).

Створаны П. Галавачом у рамане *Праз гады*, гэты эпізод узнаўляў тыповую сітуацыю ваеннага часу. Паказальна, што пісьменнік свядома дыстанцыяваў чытача ад драматычных падзей, з якімі сутыкнуліся персанажы. Больш фактаграфічны, чым эмацыйны аповед дазваляў засяродзіцца менавіта на імперсанальным і тэхналагічным – тым, што вылучыла Першую сусветную на фоне войн мінулага.

Аднаго бою, артабстрэлу ці паветранай бамбардыроўкі было дастаткова, каб персанаж-франтавік зразумеў: „я жыў, але ранейшага мяне навекі няма" (Garèckì, 1985, s. 33). Гэтая цытата з запісак М. Гарэцкага *На імперыялістычнай вайне* ілюструе змену ў самаадчуванні чалавека ў часе і прасторы татальнага ўзброенага канфлікту. У 1920–30-я гг. XX ст. да гэтай тэмы звярталіся З. Бядуля, А. Гародня, Ц. Гартны, П. Галавач, Я. Колас, К. Чорны і інш., персанажы якіх праводзілі мяжу паміж мінулым, з яго мірным антуражам, і ўласна ваеннай рэчаіснасцю. Празаікі засяроджваліся на псіхалагічных працэсах, праз якія тлумачылі своеасаблівае ўспрыманне часу (адчуванне тэмпаральнага разрыву):

> Іншы дзень выдаваўся за гадзіну, іншая ноч, доўгая, асенняя, цягнулася, як год. І калі б прайшоў сапраўды год, тыя, што правялі яго ў акопах, былі б здзіўлены. Можна падумаць, што гэта была адна толькі ноч, доўгая ноч артылерыйскага бою (Samujlёnak, 1937, s. 109).

Па магчымасці аўтары апавядалі пра міжэтнічныя адносіны, узаемадачыненне розных вайсковых чыноў і салдацкай масы. Апошняя тэма была надзвычай папулярнай, бо дазваляла разважаць і пра нараджэнне рэвалюцыйнай свядомасці, а самі падзеі 1917 г. падаваліся як адзін з адчутых персанажамі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



момантаў тэмпаральнага разрыву. А. Гароднія, З. Бядуля, М. Зарэцкі канстатавалі, што іх персанажы на фінальным этапе Першай сусветнай вайны бачылі неабходнасць барацьбы за новае грамадска-палітычнае ўпарадкаванне:

> Не ведаем, калі і як скончыцца гэтая дзікая вайна <...> кажуць, што яна скончыцца рэволюцыяй, як у 1905 г. Мы не выпусцім зброі з рук, як вернемся з вайны. Мы адплоцім усім тым, хто пасылае мільёны народу на вялікія пакуты (Bâdulâ, 1936, s. 36).

Беларуская франтавая проза апавядала пра адмысловы тып вайскоўца: персанажа-беларуса, засяроджанага на ўласным душэўным стане (Лявон Задума і Хомка Шпак у творах Максіма Гарэцкага, Янка Пралеска ў апавяданні *Дзве пуціны* Янкі Ліманоўскага). Пісьменнікі канцэнтраваліся не столькі на адцягненых разважаннях пра ролю чалавека на вайне ды пра цывілізацыйны аксіялагічны крызіс, колькі раскрывалі знакавыя пытанні быцця на прыкладзе прыватнай постаці персанажа, ад нараджэння надзеленага здольнасцю суперажываць іншым ды шукаць праўду ў самых неспрыяльных варунках. Так, галоўны герой апавядання *Дзве пуціны* Я. Ліманоўскага, патрапіўшы на фронт, адразу адчуў, што адзінота, цяжкі побыт, жорсткія адносіны паміж афіцэрамі і іх падначаленымі ў сукупнасці з жахамі вайны прыводзілі да таго, што „чалавечая істота тут траціла сваю годнасьць і вартасьць, нават цалкам трацілася ў гэтым крывавым віры" (Lìmanoŭskì, 1926, s. 15). Самыя назіральныя з персанажаў, разважаючы на тэму „чалавек на вайне", стваралі адмысловую класіфікацыю тыповых удзельнікаў баявых дзеянняў:

> ...адзін табе ходзіць і ног пад сабой не чуе, бо кожнага дня смерць сцеражэ. <...> Так і ў акопе сядзіць, і ў атаку ідзе, і, сцяўшы зубы, бяжыць па полю, і нічога не бачыць акрамя кончыка свайго штыха – так і ляціць за гэтым штыхом, каб напароцца на смерць, <...> бо мазгі ў яго даўно атруціліся. Другі – нішто. <...> І смерць над ім, і нягода над ім, над ім камандзір і фельдфебаль, – а яму хоць-бы што <...> думкі ясныя і ясныя вочы (Lyn'koŭ, 1934, s. 212).

Такім чынам, беларуская франтавая літаратура падымала пытанні пра статус асобы на татальнай вайне, пра гераізм і самаахвярнасць, пра псіха-фізічныя трансфармацыі, якія адбываліся з вайскоўцам, калі ён бачыў, як „смяецца з-пад снегу зямлісты твар мёртвым аскалам зубоў, вытыркаюць крывавым мясам куксы рук і ног, павуцінка калючага дроту перавіваецца чалавечымі кішкамі" (Krapìva, 2008, s. 272). Мастакі слова абіралі асобныя натуралістычныя малюнкі, каб засведчыць, што нельга „абпяваць войны самымі пекнымі песнямі" (Zarèckì, 1928, s. 188).

На фронце салдаты засвойвалі формулы „што чалавек, што чарвяк" (Garèckì, 2009, s. 576), „мы не людзі, мы – быдла" (Garèckì, 1985, s. 57); аксіёмы, што забойства ворага-хрысціяніна – годны ўчынак, варты пашаны і ўзнагароды,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



а вайсковы статут – аналаг біблейскіх запаветаў, ідэал сумленнай працы – „старанна страляць, калоць, падпальваць, нішчыць, руйнаваць” (Garodnâ, 1927, s. 25) і сваё, і чужое.

Удзел у пазіцыйнай вайне вымушаў па-новаму разважаць пра гераізм, бо

> наставаў такі момант, калі любы салдат мог зрабіцца героем: дастаткова было знайсці ў сабе крышку мужнасці, усхапіцца наверх, закрычаць „ура” і кінуцца ўперад, <...> лепш ісці насустрач агню, чым чакаць, калі прыйдзе твая чарга аказацца без нагі, без рукі ці проста разарваным на кавалкі (Loban, 2015, s. 60).

Персанажы-вайскоўцы з сумным гумарам разважалі пра ўласныя наіўныя ўяўленні пра гераізм, скасаваныя markiнымі праявамі татальнай вайны: „Я пайшоў працаваць у канцылярыю <...>, і <...> думаў: каб цяпер ляцеў снарад і адарваў бы мне палец на левай руцэ, – я чарціў бы праваю і паказаў бы рану толькі скончыўшы заказаную мне камандзірам працу” (Garèckì, 1985, s. 372).

Пісьменнікі акцэнтавалі ўвагу на тым, што адбывалася хуткая трансфармацыя стаўлення персанажа-вайскоўца да афіцыйнай падзякі за варты ўчынак. Ва ўмовах, калі героямі станавіліся „падпрапаршчык X. і старшы феерверкер Z., якія пасылалі па розных справах пад кулі ніжніх чыноў, а самі “рабілі” ў акопе і закапвалі лапатачкамі” (Garèckì, 1985, s. 72), станоўчая рэакцыя на фармальную пазнаку-ўзнагароду паўставала як выключэнне. Персанажы-франтавікі адчувалі, што іх сапраўдныя някідкія подзвігі дэвальваваліся ў вачах цывільных, якія прызвычаіліся да маляўнічых аповедаў кшталту: „яны ў атаку, мы на штыхі <...> пятнаццаць раз адбіваліся, ну а потым гэта мы паціснулі <...>. Як хмара тая цёмная, градавая – так лягло на тым полі германцаў” (Lyn′koŭ, 1934, s. 246). У выніку персанаж-франтавік чуў пагардлівыя выказванні: „мігдаль начапіў, нейкі крыж там аблезлы, а з тых мігдаляў багаты не будзеш” (Skrygan, 1985, s. 72).

Адначасова пісьменніцкая супольнасць, якая працавала ў 1920–30-я гг., аддавала даніну савецкай ідэалогіі, якая паслядоўна знішчала само ўяўленне пра героіку імперыялістычнай вайны. Пятрусь Броўка, пішучы ў паэме *1914* пра пакалечанага Перагуда, які „крыўду дзён спазнаў, / Цану спазнаў ён абяцанкам, – / Зубамі ўсе медалі рваў, / Як непатрэбныя бляшанкі” (Broŭka, 1957, s. 25), звяртаўся хутчэй да чытача-сучасніка, які засвоіў, што „Першая сусветная была <...> шкоднай, непатрэбнай народу вайной <...>, што яна была несправядлівай з абодвух бакоў <...> і не мела зусім ніякіх станоўчых наступстваў” (Garanin, 2014, s. 13).

Беларускія аўтары падкрэслівалі, што персанаж-франтавік меў надзённую патрэбу ў кантактаванні з роднымі ў тыле, каб канчаткова не адарвацца ад адносна звыклага ладу жыцця. Альтэрнатыўны, але не менш прыкры мікракосм вайны паўстаў у лістах з дому:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



> Мы, дзякаваць Богу, жывы і здаровы. <...> Паведамляю, што с поля ўсё сабралі. <...> Малаціць так-сама суседзі абецаліся талакой. Трысьцен так і астаўся на зімку недакончэны. Бычка лысаго прадалі ўчора за пяць рублёў, дык за два рублі купілі мыла, круп, солі, а рэшта, тры рублі, табе, татачка. <...> Купіш Богу сьвечку за саракоўку, а за рэшту – булачкі сабе (Bâdulâ, 1914, s. 2).

Працэс падобнай камунікацыі ўскладняўся, калі ў справу ўмешвалася ваенная цэнзура. Акрамя таго, пэўны кагнітыўны дысанс узнікаў, калі персанаж-камбатант спрабаваў распавесці пра ўласны франтавы вопыт, які не заўсёды выклікаў у адрасата выразна акрэсленыя асацыяцыі і спачуванне: „вядома, можна было гаварыць бог ведае што. Няважна – праўда ці няпраўда, цяпер яму не страшна, а расказаць можна і сваё, і тое, што бачыў чужое. Калі б так расказаць, як ён бачыў, – валасы маглі б падняцца дыбка” (Skrygan, 1985, s. 48).

Знаёмства з ворагам выклікала ў персанажаў-франтавікоў шэраг пытанняў, якія нарадзіліся яшчэ з даваеннага жадання даведацца пра жыццё „пад тым далёкім ярманцам і дзесьці там далёка, далёка, куды не дасягнеш вокам, не пабяжыш на праведку” [Lyn′koŭ, 1934, c. 41]. Выразная гуманістычная і антываенная скіраванасць беларускіх твораў пра падзеі 1914–1918 гг. вымагала ад пісьменнікаў свядома пазбягаць сітуацый, дзе мог спатрэбіцца лубочны вобраз персанажа-немца / аўстрыйца. Згаданы М. Гарэцкім у запісках *На імперыялістычнай вайне* анекдот („Забіты нямецкі салдат абгарэў, троху падсмажыўся. Падышла свіння і выела яму нагу. Адным словам – свая сваіх не пазнаша” (Garèckì, 1985, s. 50) засведчыў, што ў рэальнай гістарычнай сітуацыі спрацоўвалі ўзгадаваныя прапагандысцкай машынай стэрэатыпна-негатыўныя эмоцыі, якія ў мастацкай прасторы твора падаваліся выключна адпаведнымі прапагандзе.

Веды пра вайну персанажа-бежанца часам з цяжкасцямі карэлююць з вопытам салдата-акопніка. Бежанец на старонках айчыннай прозы 1920–30-х гг. трываў нястачы, змагаўся за жыццё блізкіх і захаванне асабістай і нацыянальнай ідэнтычнасці, але часам не ўсведамляў глабальны маштаб навалы, яе фатальны ўплыў на лёс чалавецтва. Дадзеная плынь вызначаецца шэрагам канцэптуальна значных тэм: адлюстраванне выгнанніцкага шляху (*Літоўскі хутарок*, *На імперыялістычнай вайне*, урыўкі з рамана *Віленскія камунары* М. Гарэцкага, другая і трэцяя квадры рамана Ц. Гартнага *Сокі цаліны*), уладкаванне і жыццё на чужыне (*Уцекачы* М. Гарэцкага, *Туды, на Нёман* Я. Коласа, абразок *Толькі сон* З. Верас) і інш.

Згубнасць вымушанага выгнання, паводле айчынных аўтараў, патрабавала падрабязнага мастацкага ўвасаблення (асабліва важнага для таго чытача, які жыў у плыні навалы-кантынуума, што хутка зносіла ў нябыт значныя для беларуса падзеі і з’явы, пакідаючы іх недаасэнсаванымі, ніяк не зафіксаванымі ў нацыянальнай культуры). Таму з асаблівай увагай К. Чорны ў рамане *Бацькаўшчына* занатаваў:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



> Уцякацкая сям'я старалася выбрацца на абочыну дарогі і прымаць сваю чорную долю ў чыстым полі сярод чужых людзей, а найчасцей бяз іх. Колы і рэшткі набытку пястрэлі паабапал гасьцінцу; кожны дзень паўз яго вырасталі новыя магілы з крыжамі, і бяз іх; небаракі клаліся парыць зямлю пад енкі і сьлёзы сваіх родных пакутнікаў, а праз некалькі часу <...> тыя самыя, што плакалі нядаўна, хаваючы свайго блізкага, самі разьвіталіся з жыццём на гэтым-жа самым гасьцінцы (Čorny, 1932, s. 48).

Такія разгорнутыя малюнкі станавіліся адмысловым помнікам цэлай плыні беларусаў „без віны вінаватых", пакараных вайной.

Падарожжа па бежанскіх шляхах пакідала час для назірання за зменены́м да непазнавальнасці жыццём, асэнсавання асобных аксіялагічных праблем. Пісарэвіч М. Гарэцкага прыгадаў знакавы для сябе момант: „людзі абляпілі цягнік, як мухі <...>, на першай станцыі адзін старэнькі ўцякач сядзеў на прыступачцы, загледзеўся, – як трахнецца галавою аб жалезны нейкі слупок, зваліўся – і душа з яго вон" (Garèckì, 2009, s. 565). Празаік дазволіў чытачу паназіраць, як персанаж спраецыраваў падзею на ўласную персону: Пісарэвіч жахнуўся ад таго, што смерць чалавека прайшла незаўважанай. Прадчуванне новых змен набыло апакаліптычны характар, таму бежанцы падымалі пытанні, вартыя Іова: „наша гора свет заліло, <...> вякамі не вычарпаць яго <...> А завошта? <...> Перад кім і што мы саграшылі?" (Gartny, 1989, s. 263).

Пачуццё настальгіі, жаданне вярнуцца на Радзіму яднала персанажаў-бежанцаў з палоннымі немцамі ці аўстрыйцамі, якія адчувалі, што нягледзячы на нястачы, духоўны ўціск і асабістыя праблемы, „адалявала радзіма іх на чужой староны" (Lynʹkoŭ, 1928, s. 2), бо „чакаеш чагосьці, чакаеш радзіму пабачыць, свае родныя гоні <...>. А тут яшчэ табе хоць-бы ліст, хоць-бы слова, і жывеш, як у поцемках (Lynʹkoŭ, 1928, s. 2).

Тылавая плынь у беларускай прозе вылучаецца матывам вайны „недзе там" (пецярбургскія раздзелы ў рамане Ц. Гартнага *Сокі цаліны*, урыўкі з *Камароўскай хронікі* М. Гарэцкага, апавяданне *На жалезнай дарозе* Я. Коласа, аповесці *Набліжэнне* З. Бядулі і *На чырвоных лядах* М. Лынькова) – вайны, што спачатку апасродкавана (у выглядзе мабілізацыі, забеспячэння фронту харчам і фуражом, праз прэсу, чуткі і лісты з фронту, вусныя аповеды параненых, франтавікоў на пабыўцы, часам палонных) датычылася персанажа, не знаёмага з праявамі тэхналагізаванай бойні і не дасведчанага ў актуальных палітычных павевах. Падобныя персанажы заўважалі сваю прагу да новых, няхай і не вельмі дакладных звестак, „пра немцаў далёкіх, <...> аб тых чамаданах страшэнных, аб тых пузырах цэпелінаўскіх" (Lynʹkoŭ, 1981, s. 140). Часцей за ўсё месцам дзеяння ў творах пра тыл абіралася беларуская вёска, якая з пачаткам вайны „напружылася, спужалася, а потым – ракою сьлёз залілася" (Nìkanovìč, 1929, s. 3). Паступова наступствы сусветнага канфлікту рабіліся ўсё больш відавочнымі, а персанажы пачыналі ідэалізаваць недалёкае мінулае: „Бывала – што? <...>

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Выйдзеш у гэткую пару на вуліцу, дык не наслухаешся: там пяюць дзяўчаты, там падцінаюць начлежнікі за сялом, там грыміць дудар <...> загуляе моладзь, аж усё трасецца <...> А цяпер дзе ж гэтая краса?" (Mâleška, 2008, s. 260).

Вайна адбівалася на штодзённым жыцці і дарослых, і дзяцей. Так, З. Бядуля ў аповесці *Набліжэнне* распавёў пра адмысловую гуманітарную катастрофу, што адбылася ў мястэчку Каганцы яшчэ да таго, як яно стала прыфрантавым. Апавядальнік адзначыў:

> На абшырным выгане стаіць новая школа з чорнымі ямінамі акон без шкла. Школа пустуе з мінулай восені, бо настаўніка забралі па мабілізацыі. Няма цяпер лепшай забаўкі для дзяцей як запусцелая школа. Бадай што адзічэлыя хлапчукі гуляюць там у вайну. <...> Школьныя кнігі сяляне забралі на цыгаркі, геаграфічныя карты і малюнкі звяроў і жывёлін парасцягалі са сцен школы вясковыя дзяўчаты на аздабленне сваіх куткоў па хатах (Bâdulâ, 1936, s. 29–30).

Адзначым, што беларуская літаратура (аповесць *Паўстанне* Макара Паслядовіча) адлюстроўвала ўплыў падзей вайны на свядомасць маладога пакалення, якое сталела ў плыні навалы: „нават дзеці <...> разбіраліся, як адкрываецца і закрываецца затвор, якія і да якой вінтоўкі падыходзяць патроны. Ідучы на вечарынку, хлопцы клапатліва запіхалі ў кішэню наган ці браўнінг" (Paslâdovìč, 1988, s. 95). Зброя, вайсковае адзенне, паводле новага пакалення, станавіліся зухаватым знакам далучанасці да надзвычайных падзей, сведчаннем нейкай новай адукаванасці.

Тылавая літаратура распрацоўвала вобраз персанажа-параненага, інваліда, ахвяры вайны. Чалавек пасля фронту будаваў новыя адносіны з акаляючым соцыумам, які не заўсёды ўлічваў ягоны стан. Беларускія пісьменнікі падкрэслівалі, што на пачатковых этапах вайны пакалечаныя выклікалі спагаду: „нібы па нейкаму таямнічаму загаду ў большасці пасажыраў расчыняюцца сэрцы да гарачага пачуцця. <...> У адзін момант вочы блішчаць дабратою, чуласцю, захапленнем" (Bâdulâ, 1936, s. 7). Далейшыя падзеі на фронце павялічылі колькасць траўмаваных, а жыхароў тылу паступова агарнула абыякавасць, якая перайшла ў пагарду. У рамане *Сокі цаліны* Ц. Гартны падаў самыя радыкальныя трансфармацыі: „з герояў і абаронцаў раненыя рабіліся назолаю, лішніцай" (Gartny, 1989, s. 190). Самі ж пакалечаныя вайной ветэраны наноў спасцігалі жыццё, знаходзячы простыя рэчы (праца, сузіранне прыроды, сяброўскія адносіны), якія мелі большы сэнс, чым словы (*Набліжэнне* З. Бядулі, *На чырвоных лядах* М. Лынькова).

У межах тылавой літаратуры разглядаецца постаць персанажа-дэзерціра, учынак якога больш не атаясамліваўся з „ламаннем прысягі", „смяротным грахом, загубай душы і цела на гэтым і на тым свеце" (Garèckì, 1984, s. 200). З. Бядуля ў аповесці *Набліжэнне* падрабязна спыніўся на побыце дэзерціраў, якія спачатку ўспрымаліся як „маленькі толькі, ледзь прыкметны, цень вайны,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



нібы цень вераб'я" (Bâdulâ, 1936, s. 27). К. Чорны, даўшы слова гэтым персанажам, вычарпальна патлумачыў матывы іх учынкаў: „Я ўжо раз траха не памёр, нямаведама чаго, за каго і за што" (Čorny, 1932, s. 51); „Можа яно і ня добра я зрабіў. <...> Унь мая сям'я жыве ля самае пазіцыі, ня сёньня, дык заўтра можа немец зойме. А я што адзін буду аставацца ад сям'і? (Čorny, 1932, s. 51).

Беларуская літаратура пра Першую сусветную вайну распрацоўвала *тэму жыцця пад нямецкай акупацыяй* (*Набліжэнне* З. Бядулі, *Віленскія камунары* М. Гарэцкага), якое пачыналася са знаёмства са знакамітым „Ordnung"ам: „У іх такі орднунг, што нават запісваюць, ад каго, што і колькі ўзята, – і выдаюць квіткі на атрыманне грошай" (Bâdulâ, 1936, s. 166). Гіпертрафаваная ўвага да дысцыпліны поруч з непрыязным стаўленнем да мясцовага насельніцтва – вызначальныя моманты, увасобленыя айчыннымі мастакамі слова, якія не забываліся на стварэнне вобраза тыповага іншаземца-вайскоўца з «алавянымі вачамі і вільгельмаўскімі вусамі. Ён размахваў нагайкай ды ўсё крычаў: «Дойчлянд ібер алес». Каганецкіх называў «русішэ швайн»„ (Bâdulâ, 1936, s. 165). Бліжэйшае знаёмства з акупантамі давала падставы для разбурэння яшчэ даваенных нацыянальных стэрэатыпаў: „Я думаў, што ўсе немцы павінны быць грузныя, таўстабрухія, белацелыя. <...> А тут <...> цягнуліся і дробненькія, худыя, з падцягнутымі жыватамі, сагнутыя ў крук" (Garèckì, 1985, s. 210–211). Персанажы-беларусы пакутвалі ад „гаспадарлівасці" прадстаўнікоў новай улады, якія „ўсё вывозілі ці ў глыбокую Нямеччыну, ці на розныя нямецкія франты, ці на пабудову дамоў, складаў, вузкакалеек у розных нямецкіх тылах" (Garèckì, 1985, s. 223). Гэтыя ж дзеячы не забываліся „скрозь пляжыць у пень Белавежы страі – // Уцеху і гордасць планеты Зямлі. <...> // Аблава вільгельмаўцаў на смірных зуброў, – // На снезе, запёкшыся, свежая кроў» (Pušča, 1993, s. 223).

Назіранні франтавіка, жыхара тыла, бежанца за бойняй вымагалі пераглядзець адносіны да рэлігіі і святароў. У апавяданні Эдуарда Самуйлёнка *Герой нацыі* адзначалася: „Бог дзікуноў скончыў акадэмію генеральнага штабу па класу паветранай бамбардыроўкі і перакваліфікаваў святых" (Samujlënak, 1937, s. 121). Здавалася, што толькі так мажліва патлумачыць атмасферу разбурэння. Асобна айчынныя аўтары разглядалі праблему дачынення шараговага персанажа-цывільнага да аб'яўленага афіцыйнымі ўладамі ворага, які таксама вызнаваў хрысціянства. Штуршком да такіх разважанняў зазвычай станавілася якое-небудзь патрыятычнае мерапрыемства: „Унь у нас у гарадку малебства нядаўна адпраўлялася, каб бог памог пабіць германцаў. А германцы ня просяць бога, каб ён памог ім пабіць расійцаў?" (Čorny, 1932, s. 61). Стаўленне да рэлігіі набывала і іншыя сэнсы ў негатыўным спектры. Савецкае грамадства ваяўніча ставілася да гэтага „пережытка мінулага". Пятрусь Броўка пісаў пра ганебнае „зрашчэнне" дзяржаўнага і божага: „Бог прымаў у кабінеце. // «За яго, за цара і айчыну», // Пад крыжамі дарогі // Ішлі да яго" (Broŭka, 1957, s. 20). Слова божае з вуснаў святара або чыноўніка пераставала асацыявацца з гуманным светаўпарадкаваннем.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Вяртанне на зруйнаваную вайной радзіму станавілася сэнсавай дамінантай асобных твораў са згадкамі пра Першую сусветную. Так, у апавяданні Я. Ліманоўскага *На разведцы* персанаж выпадкова трапляе ў знаёмае яму мястэчка, дзе

> брукаваныя вуліцы парасьлі рэдкай зелянінай. Дзе-ні-дзе на месцы дамоў стаялі яшчэ рэшткі мураваных сьцен і кучы руін. Вялізны гмах касьцёлу, з прабітымі сьценамі, падзюраўленым, падзёртым дахам панура высіўся над вялізнымі могілкамі мястэчка. <...> Вуліцы і рынак апаясаны чорнай ніткай акопаў (Lìmanoǔskì, 1928, s. 6).

Беларускі ландшафт вайны пададзены і ў аповесці *Паўстанне* М. Паслядовіча:

> пустэльнай і знявечанай выглядала мясцовасць. Замест вёсак валяліся чорныя, абмытыя дажджамі галавешкі, сярод якіх недарэчна тарчалі закураныя дымам печы. <...> Па ўзгорках цягнуліся яшчэ незарослыя травою акопы, жоўтыя ад іржы калючага дроту. Чарнелі вялізныя яміны, вывернутыя снарадамі (Paslâdovìč, 1988, s. 22).

Беларускія пісьменнікі падкрэслівалі, што вяртанне дадому пасля вайны прымушала персанажаў (найперш франтавікоў, бежанцаў) знаёміцца з новай „мілітарызаванай" рэчаіснасцю, дзе тое, што раней асацыявалася выключна з вайсковай дысцыплінай, армейскім жыццём пад час паходу, акопным існаваннем, пачало ўспрымацца як нармальнае і нават святочна-прыгожае. Напрыклад, М. Паслядовіч заўважыў некаторыя дэталі, што пацвярджалі, наколькі глыбока навала-кантынуум адбілася на жыцці цывільнага: „вайна <...> палажыла сваю пячаць на адзенне людзей. Усюды былі цяпер відаць яе адзнакі. Ці то ў салдацкіх паясах, у доўгіх да пят шынялях" (Paslâdovìč, 1988, s. 60–61). Досыць эмацыйна зрэагаваў на змены ў побыце беларускай вёскі персанаж нарыса *З дарогі* Міхася Мяцёлкі: „Ня соладка <...> цяпер жывецца. Рашыліся ўсяго. <...> Бачыш, якая у нас ціпер бязталковіца. Ды яшчэ дрыжыш заўсюды, каб і адгэтуль уцякаць ні давялося. <...> І вясковая моладзь распусцілася. Нікога ня слухаюць" (Mâcëlka, 1917, s. 2). Асаблівае ўражанне на чытача згаданага нарыса робіць мова моладзі („Вочым ціпер скучна у нас. Раньше, як былі салдаты, заводзілі ігрышча, гуляньне, тэатр устроілі, а ціпер і забавіцца нечым" (Mâcëlka, 1917, s. 2)), у якой не засталося павагі да свайго, адметна беларускага. Айчынныя аўтары заўважалі, што моладзь страчвала звыклыя формы назапашання ведаў і развіцця светапогляду. На змену ім прыходзіла жорсткае паваеннае жыццё з абавязкамі дарослых. К. Чорны адзначаў, што ва ўмовах Першай сусветнай і духоўнае сталенне адбывалася імгненна:

> Дзесяцігодныя дзяўчаткі жалі жыта, дванаццацігодныя хлапчукі аралі як мае быць, а пятнаццацігодныя самі вялі гаспадарку, кармілі сем'і працай сваіх рук. <...> Шаснаццацігодныя хлопцы хадзілі па пілоўцы, а семнаццацігодныя пачыналі пераймаць цяслярства (Čorny, 2008, s. 5).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Але гэта былі атыповыя трансфармацыі, траўматычныя для непадрыхтаванай псіхікі, асабліва калі маладыя людзі раслі без бацькі, які „не вярнуўся з расчыненага жорала вайны, якая праглынула яго, як глытае полымя камара, што кружыўся ў цёплым дыме запаленага дома" (Baranavyh, 1989, s. 38).

Варты ўвагі і той факт, што беларускае прыгожае пісьменства (хаця і фрагментарна) увасобіла некаторыя праявы ваеннай рэчаіснасці ў іншых краінах. Акрамя падзей у Германіі ды Аўстрыі (*На імперыялістычнай вайне* М. Гарэцкага, *Сокі цаліны* Ц. Гартнага, *Варта на Рэйне* А. Гародні), беларуская проза звярнулася і да жыцця ў ЗША на самым пачатку Першай сусветнай. У апавяданні *Вандраванне Васіля* Аляксандра Сянкевіча занатаваны эпізоды, звязаныя з узгадваннем патрыятычных памкненняў шараговага амерыканца ў сувязі з вайной: „Часта на вуліцах, на плошчы можна было пабачыць такі малюнак. Група афіцэраў і „патрыётаў" падымала „амэрыкан флэг", усе, хто йшоў па вуліцы або стаяў на плошчы, павінны былі спыніцца, здымаць капялюшы. А хто гэтага не рабіў, таго ставілі на калені і прымушалі цалаваць «старс-энт страйпс»" (Sânkevič, 1926, s. 47).

Пазіцыянаванне тэмы Першай сусветнай вайны ў беларускай літаратуры выразна спецыфічнае і падзяляецца на два этапы. Айчынныя мастакі слова, якія ў 20–30-я гг. XX ст. пісалі пра Першую сусветную, у пераважнай большасці зафіксавалі яе праявы ў дачыненні да звычайнага чалавека, засяродзіліся на будзённасці: мабілізацыі, сутыкненні з акопным побытам і сродкамі масавага знішчэння, адносінах з вышэйшымі чынамі, шпітальным жыцці, бежанстве. У сукупнасці твораў пра 1914–1918 гг. дэталёва разгледжана, як час, абставіны, вопыт персанажаў трансфармавалі вобраз ворага (ад варвара-чужынца да спакутаванага вайной аднадумца). Творы наступага этапу, якія пабачылі свет у другой палове XX ст., вызначаліся спробай упісаць падзеі Першай сусветнай у шырокі і нацыянальна-маркіраваны гістарычны кантэкст. Абодва этапы літаратурна-мастацкага асэнсавання 1914–1918 гг. мелі канцэптуальна значную кропку судакранання, звязаную з матывам *вайна / навала-кантынуум*, аднолькава значным і для Змітрака Бядулі, Максіма Гарэцкага, Міхася Зарэцкага, і для іх наступнікаў у звароце да глабальнай тэмы Першай сусветнай: Леаніда Дайнекі, Віктара Карамазава, Алеся Якімовіча.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Adamovič, Ales′. (1982a). Otvety na anketu „Voprosov literatury". W: *Sobranie sočinenij*, t. 2 (s. 409–411). Minsk: Mastackaja litaratura. [Адамович, Алесь. (1982a). Ответы на анкету „Вопросов литературы". В: *Собрание сочинений*, т. 2 (с. 409–411). Мінск: Мастацкая літаратура].

Adamovič, Ales′. (1982b). *Vojna i derevnâ v sovremennoj literature*. Minsk: Nauka i tehnika. [Адамович, Алесь. (1982b). *Война и деревня в современной литературе*. Минск: Наука и техника.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Alìg. (1926). Rècènzìâ na knìgu: Garèckì, M. Na ìmpèryâlìstyčnaj vajne (zapìskì). *Maladnâk*, 9, s. 103–104. [Аліг. (1926). Рэцэнзія на кнігу: Гарэцкі, М. На імпэрыялістычнай вайне (запіскі). *Маладняк*, 9, с. 103–104].

Baranavyh, Symon. (1989). *Novaâ daroga: Apavâdannì, apovescì, raman, lìsty*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Баранавых, Сымон. (1989). *Новая дарога: Апавяданні, аповесці, раман, лісты*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Bâdulâ, Zmìtrok. (1917). Galgofa, *Vol'naâ Belarus'*, 8, s. 2. [Бядуля, Змітрок. (1917). Галгофа, *Вольная Беларусь*, 8, с. 2].

Bâdulâ, Zmìtrok. (1914). Na staâncy. *Naša Nìva*, 38, s. 2–3. [Бядуля, Змітрок. (1914). *На стаянцы*. *Наша Ніва*, 38, с. 2–3].

Bâdulâ, Zmìtrok. (1936). *Nablìžènne*. Mensk: Dzâržaǔnae vydavectva Belarusì. [Бядуля, Змітрок. (1936). *Набліжэнне*. Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі].

Broǔka, Pâtrus′ (1957). *Zbor tvoraǔ*, t. 2 (s. 9–25). Mìnsk: Belaruskae dzâržaǔnae vydavectva. [Броўка, Пятрусь (1957). *Збор твораў*, т. 2 (с. 9–25). Мінск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва].

Čorny, Kuz′ma. (1932). *Bac'kaǔščyna*. Mensk: DVB LiM. [Чорны, Кузьма. (1932). *Бацькаўшчына*. Менск: ДВБ ЛіМ].

Čorny, Kuz′ma. (2008). *Pošukì budučynì. Raman. Apovescì. Apavâdanne*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Чорны, Кузьма. (2008). *Пошукі будучыні. Раман. Аповесці. Апавяданне*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Faulks, Sebastian (2012). *Birdsong*. London: Vintage books.

Galavač, Platon. (1984). *Praz gady*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Галавач, Платон. (1984). *Праз гады*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Garanìn, Sârgej. (2014). Pradmova. W: *Peršaâ susvetnaâ vajna ǔ narodnaj pamâcì ì mastackìm adlûstravannì: mat. mìžnar. navuk. kanf.* (s. 11–15). Mìnsk: Prava ì èkanomìka. [Гаранін, Сяргей. (2014). Прадмова. В: *Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні: мат. міжнар. навук. канф.* (с. 11–15). Мінск: Права і эканоміка].

Garèckì, Maksìm. (2009). *Vybranyâ tvory*. Mìnsk: Knìgazbor. [Гарэцкі, Максім. (2009). *Выбраныя творы*. Мінск: Кнігазбор].

Garèckì, Maksìm. (1984). *Zbor tvoraǔ*, t. 1. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Гарэцкі, Максім. (1984). *Збор твораў*, т. 1. Мінск: Мастацкая літаратура].

Garèckì, Maksìm. (1985). *Zbor tvoraǔ*, t. 3. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Гарэцкі, Максім. (1985). *Збор твораў*, т. 3. Мінск: Мастацкая літаратура].

Garodnâ, Ales′. (1927). U poplavah. *Maladnâk*, 7/8, s. 23–35. [Гародня, Алесь. (1927). У поплавах. *Маладняк*, 7/8, с. 23–35].

Gartny, Cìška. (1989). *Zbor tvoraǔ*, t. 3. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Гартны, Цішка. (1989). *Збор твораў*, т. 3. Мінск: Мастацкая літаратура].

Gubskaâ, Vol′ga. (2019). Dakumental′ny fakt âk vobraz mastackaj litaratury, *Studia Wschodniosłowiańskie*, 19, s. 63–74. [Губская, Вольга. (2019). Дакументальны факт як вобраз мастацкай літаратуры, *Studia Wschodniosłowiańskie*, 19, s. 63–74].

Kolas, Âkub (1975). *Zbor tvoraǔ*, t. 8. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Колас, Якуб (1975). *Збор твораў*, т. 8. Мінск: Мастацкая літаратура].

Krapìva, Kandrat. (2008). *Vybranyâ tvory*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Крапіва, Кандрат. (2008). *Выбраныя творы*. Мінск: Беларуская навука].

Kras, Ìllâ. (1928). Čyrvonaâ Armìâ ǔ belaruskaj lìtaratury. *Lìtaraturny dadatak da gazèty „Saveckaâ Belarus'"*, 3, s. 1–3. [Крас, Ілля. (1928). Чырвоная Армія ў беларускай літаратуры. *Літаратурны дадатак да газэты „Савецкая Беларусь"*, 3, с. 1–3].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



Lìmanoǔskì, Ânka. (1926). Dz′ve pucìny. *Polymâ*, 1, s. 3–33. [Ліманоўскі, Янка. (1926). Дзьве пуціны. *Полымя*, 1, с. 3–33].

Lìmanoǔskì, Ânka. (1928). Na raz′vedcy. *Lìtaraturny dadatak da gazèty „Saveckaâ Belarus′"*, 3, s. 6–7. [Ліманоўскі, Янка. (1928). На разьведцы. *Літаратурны дадатак да газэты „Савецкая Беларусь"*, 3, с. 6–7].

Loban, Mìkola. (2015). *Vybranyâ tvory*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Лобан, Мікола. (2015). *Выбраныя творы*. Мінск: Беларуская навука].

Lyn′koǔ, Mìhas′. (1981). *Zbor tvoraǔ u vas′mì tamah*, t. 1. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Лынькоў, Міхась. (1981). *Збор твораў у васьмі тамах*, т. 1. Мінск: Навука і тэхніка].

Lyn′koǔ, Mìhas′. (1934). *Na čyrvonyh lâdah*. Mensk: DVB LìM. [Лынькоў, Міхась. (1934). *На чырвоных лядах*. Менск: ДВБ ЛіМ].

Lyn′koǔ, Mìhas′. (1928). U vagone. *Lìtaraturny dadatak da gazèty „Saveckaâ Belarus′"*, 1, s. 1–3. [Лынькоў, Міхась. (1928). У вагоне. *Літаратурны дадатак да газэты „Савецкая Беларусь"*, 1, с. 1–3].

Mâcëlka, Mìhas′. (1917). Z darogì. *Vol′naâ Belarus′*, 8, s. 2. [Мяцёлка, Міхась. (1917). З дарогі. *Вольная Беларусь*, 8, с. 2].

Mâleška, Mìhas′. (2008). Šèpty. W: *Rastralânaâ lìtaratura* (s. 258–263). Mìnsk: Knìgazbor. [Мялешка, Міхась. (2008). Шэпты. В: *Растраляная літаратура* (с. 258–263). Мінск: Кнігазбор].

Mušynskì, Mìhas′. (2014). U pošukah šlâhoǔ volì. W: Âkub Kolas. *Na šlâhah volì* (s. 5–20). Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Мушынскі, Міхась. (2014). У пошуках шляхоў волі. У: Якуб Колас. *На шляхах волі* (с. 5–20). Мінск: Мастацкая літаратура].

Nìkanovìč, Mìkola. (1928). Za plâčyma gadoǔ. *Lìtaraturny dadatak da gazèty „Saveckaâ Belarus′"*, 9, s. 3–5. [Нікановіч, Мікола. (1928). За плячыма гадоў. *Літаратурны дадатак да газэты „Савецкая Беларусь"*, 9, с. 3–5].

Paslâdovìč, Makar. (1988). *Paǔstanne. Svâtlo nad Lìpskam*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Паслядовіч, Макар. (1988). *Паўстанне. Святло над Ліпскам*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Pušča, Âzèp. (1993). *Zbor tvoraǔ u 2 tamah*, t. 1. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Пушча, Язэп. (1993). *Збор твораў у 2 тамах*, т. 1. Мінск: Мастацкая літаратура].

Samujlënak, Èduard. (1937). *Dačka èskadrona*. Mìnsk: DVB. Mastackaâ lìtaratura. [Самуйлёнак, Эдуард. (1937). *Дачка эскадрона*. Мінск: ДВБ. Мастацкая літаратура].

Sânkevìč, Alâksandr. (1926). Vandravan′ne Vasìlâ. *Polymâ*, 1, s. 34–50. [Сянкевіч, Аляксандр. (1926). Вандраваньне Васіля. *Полымя*, 1, с. 34–50].

Sìn′kova, Lûdmìla. (2017). „Zvyšlìtaratura" âk ìdèâ Alesâ Adamovìča ì praktyka Svâtlany Aleksìevìč. W: *Aksiologičeskij diapazon hudožestvennoj literatury: sbornik naučnyh statej* (s. 67–69). Vitebsk: VGU imeni P.M. Mašerova. [Сінькова, Людміла. (2017). «Звышлітаратура» як ідэя Алеся Адамовіча і практыка Святланы Алексіевіч. У: *Аксиологический диапазон художественной литературы: сборник научных статей* (с. 67–69). Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова].

Skrygan, Ân. (1985). *Vybranyâ tvory ǔ dvuh tamah*, t. 2. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura. [Скрыган, Ян. (1985). *Выбраныя творы ў двух тамах*, т. 2. Мінск: Мастацкая літаратура].

Zarèckì, Mìhas′ (1928). *S′cežkì-darožkì*. Mensk: Dzâržaǔnae vydavectva Belarusì. [Зарэцкі, Міхась (1928). *Сьцежкі-дарожкі*. Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі].

SUBMITTED: 2023.08.02
ACCEPTED: 2024.10.28
PUBLISHED ONLINE: 2025.01.08

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 19/07/2026 11:57:40



## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Zoya Tratsiak / Зоя Трацціяк** – Białoruś, Mińsk, Połocki Uniwersytet Państwowy; dr hab.; *specjalność*: literaturoznawstwo; *zainteresowania naukowe*: literatura białoruska, literatura amerykańska, literatura o pierwszej wojnie światowej.

*Adres*: вул. Стралецкая, 4, Полацк, Віцебская вобл., 211400, Беларусь

*Wybrane publikacje:*

1. Трацціяк, Зоя. (2021). 'Continuous War' Motif in Belarusian Prose about World War I: Some Trends of Development. *Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология*, 4, с. 115–120.
2. Трацціяк, Зоя. (2021). *Беларуская і амерыканская проза пра Першую сусветную вайну: узроўні параўнальнага аналізу*. Наваполацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.
3. Трацціяк, Зоя. (2019). Постаць немца у беларускай ваеннай прозе XX стагоддзя. *Białorutenistyka Białostocka,* 11, с. 173–188.
4. Трацціяк, Зоя. (2018). Увасабленне аксіялагічнага крызісу ў амерыканскай прозе пра Першую сусветную вайну. *Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 3. Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія*, 8/2, с. 11–18.
5. Трацціяк, Зоя. (2015). *Паэтыка амерыканскай і беларускай прозы пра Першую сусветную вайну (на прыкладзе творчасці Э. Хемінгуэя і М. Гарэцкага)*. Наваполацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.